## Інфармацыйная карта праекта

| № п/п | Структурныя кампаненты | Змест |
|---|---|---|
| *1.* | *Назва праекта* | ***“Нацыянальнае ў кожны дом”***<br>Знаёмства з культурнай і гістарычнай спадчынай Радзімы праз наведванне музеяў роднага краю, вывучэнне значэння прозвішчаў вучняў класа |
| *2.* | *Тэрмін рэалізацыі праекта* | Верасень 2018 - Май 2019 |
| **3.** | ***Асноўная ідэя праекта*** | Праект накіраваны на далучэнне вучняў да актыўнай сумеснай дзейнасці, у навукова-даследчую і пошукавую дзейнасць па вывучэнню культурнай і гістарычнай спадчыны, вывучэнне значэння прозвішчаў, якія праяўляць іх нацыянальны характар, а таксама на арганізацыю працы па захаванню нацыянальнай спадчыны нашага народа. |
| **4.** | ***Адрасацыя праекта*** | Вучні, настаўнікі школы і бацькі |
| **5.** | ***Удзельнікі праекта*** | Вучні V “А” класа |
| **6.** | ***Партнёры*** | Турыстычнае агенства “Рубенс” г. Ваўкавыск |
| **7.** | ***Мэта праекта*** | Садзейнічаць паглыбленню ведаў пра традыцыі, звычаі, культуру беларускага народа праз наведванне музеяў, гістарычных і культурных мясцін роднага краю, вывучэнне значэння прозвішчаў вучняў класа |
| **8.** | ***Задачы праекта*** | 1. Пашырыць веды пра гістарычную і кульурную спадчыну Беларусі праз наведванне музеяў роднага краю, віртуальныя вандроўкі, сустрэчы са знакамітымі людзьмі;<br>2. Пазнаёміцца з семантыкай і структурай прозвішчаў вучняў класа;<br>3. Выявіць гісторыю ўзнікнення прозвішчаў вучняў класса.<br>4. Распрацаваць слоўнік прозвішчаў вучняў класса.<br>5. Скласці відэаролікі “Вандроўка па родным краі” (на аснове праведзеных экскурсій і паходаў)<br>5. Папоўніць кабінет беларускай мовы дыдактычным матэрыялам “Прозвішчы вучняў класа. Семантыка і структура” |

| | | |
|---|---|---|
| **9.** | ***Рэсурсы праекта*** | ● зацікаўленасць вучняў<br>● зацікаўленасць настаўнкаў і бацькоў, валоданне настаўнікамі інавацыйнымі тэхналогіямі |
| **10.** | ***Этапы рэалізацыі*** | ● Арганізацыйны (Верасень 2018 г.)<br>● Практыка-рэалізуючы (Кастрычнік 2018 – красавік 2019 г.)<br>Абагульняючы (Май 2019 г.) |
| **11.** | ***Чакаемыя вынікі праекта*** | 1. Папаўненне кабінета беларускай мовы і літаратуры краязнаўчымі матэрыяламі і экспанатамі<br>2. Афармленне матерыялаў, звязаных з паходжаннем прозвішчаў вучняў класа, экускурсіямі і паходамі<br>3. Атаясамліванне кожным навучэнцам непарыўнай сувязі са сваім народам, дзяржаваю, культурай спадчынай народа<br>4. Фарміраванне грамадзянска – патрыятычнай, актыўнай пазіцыі, уключэнне ў дзейнасць, якая мае сацыяльную накіраванасць. |

## Механізм рэалізацыі праекта

- **Арганізацыйны этап (Верасень 2018)**

Стварэнне творчай групы са складу вучняў, настаўнікаў, бацькоў з мэтаю планавання, аналізу дзейнасці па праекту.

- **Практыка-рэалізуючы (Верасень 2018 – май 2019)**

План работы над праектам

| № п/п | Назва мерапрыемства | Тэрмін |
|---|---|---|
| 1. | Складанне плана работы на год | Верасень 2018 г. |
| 2. | Экскурсія па маршруту “Ваўкавыск -Бярозаўка – Ліда – Ваўкавыск” (знаёмства з вытворчасцю вырабаў са шкла ў Беларусі, наведванне цэнтра МЧС, Лідскага замка) | Кастрычнік 2018 |
| 3. | Збор і афармленне матэрыялаў “Прозвішчы вучняў V “А” класа” | На працягу года |
| 4. | Знаёмства з літаратурай і інтэнэт – рэсурсамі па тэме “Прозвішчы беларусаў ” | Лістапад 2018 |
| 5. | Экскурсія ў г. Мінск (Наведванне нацыянальнай бібліятэкі, Дзяржаўнага цырка Рэмпублікі Беларусь) | Снежань 2018 |
| 6. | Віртуальныя вандроўкі (знаёмства з культурнымі і гістарычнымі помнікамі нашай Радзімы) | Студзень 2019 |
| 7. | Класная гадзіна “Адкуль пайшло маё прозвішча” | Люты 2019 |
| 8. | Музей афганскай вайны | Люты 2019 |
| 9. | Выступленне на бацькоўскім сходзе“Адкуль пайшло маё прозвішча” | Сакавік 2019 |
| 10. | Наведванне музея імя Баграціёна і школьнага музея. Знаёмства з гісторыяй нашага горада | На працягу навучальнага года |

| | | |
|---|---|---|
| 11. | Экскурсія ў г.Гродна. Наведванне Гродзенскага драматычнага тэатра, “Цікавага музея” (знаёмства з гісторыяй праса і іншых хатніх прылад працы беларусаў) | Сакавік 2019 |
| 12. | Стварэнне слоўніка “Прозвішчы вучняў нашага класа” | Красавік 2019 |
| 13. | Стварэнне відэаролікаў “Вандроўка па родным краі” | На працягу года |
| 14. | Паход – экскурсія “Ваўкавыск – Шавулічы – Карпаўцы – Ваўкавыск” (прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка – фашысцкіх захопнікаў) | Май 2019 |
| 15. | Афармленне і прадстаўленне матэрыялаў праекта на фестывалі дзіцячых ініцыятыў | Май 2019 |
| 16. | Размяшчэнне матэрылаў на сайце і публікацыі ў СМІ | Май 2019 |

- **Абагульняючы этап (Май 2019 г.)**

  Падвядзенне вынікаў работы па праекту. Стварэнне прэзентацыі і справаздачы, прадстаўленне вынікаў сваёй дзейнасці.

**Чакаемыя вынікі:**

2019 год аб’яўлены Годам малой радзімы. Таксама гэта год 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка – фашысцкіх захопнікаў і 75 – годдзя стварэння Гродзенскай вобласці. Мяркуецца, што праект будзе садзейнічаць паглыбленню ведаў пра традыцыі, звычаі, гістарычную і культурную спадчыну беларускага народа праз знаёмства з гісторыяй паходжання прозвішчаў вучняў класа, наведванне гістарычных і культурных аб’ектаў нашай Радзімы, а таксама будзе спрыяць далучэнню вучняў да актыўнай сумеснай дзейнасці.

У гэтым навучальным годзе адной з задач нашага піянерскага атрада з'яўлялася выхаванне свядомага грамадзяніна сваёй Радзімы. І таму тэма нашай ініцыятывы: ***“Нацыянальнае ў кожны дом***”. На працягу гэтага часу мы знаёміліся з гістарычнай і культурнай спадчынай нашага народа, наведвалі найбольш цікавыя куточкі нашай Радзімы як падчас экскурсій і паходаў, так і падчас віртуальных вандровак.

**Матэрыялы ініцыятывы ў гэтым навучальным годзе мы прадстаўляем у выглядзе двух блокаў**:

1. Вандроўка па родным краі ( “Ваўкавыск – Бярозаўка – Ліда – Ваўкавыск” ,дзе наведалі шклозавод, цэнтр МЧС, Лідскі замак; “Ваўкавыск – Мінск – Ваўкавыск” з наведваннем Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь  і Беларускага дзяржаўнага цырка; музей афганскай вайны г. Ваўкавыск, “Ваўкавыск – Гродна – Ваўкавыск” з наведваннем Гродзенскага драматычнага тэатра і “Цікавага музея”, “Ваўкавыск – Шавулічы – Карпаўцы – Ваўкавыск”, музей імя Баграціёна, музей СШ№5)
2. Прозвішчы вучняў V “А” класа.

У верасні быў распрацаваны план мерапрыемстваў па рэалізацыі ініцыятывы, і на працягу навучальнага года мы планавалі і правадзілі экскурсіі, віртуальныя вандроўкі, вывучалі, адбіралі, аналізавалі, апарцоўвалі матэрыялы згодна рапрацаванага плана.

30 кастрычніка 2018 года мы адправіліся на экскурсію па маршруту "Ваўкавыск - Бярозаўка - Ліда - Ваўкавыск", дзе пазнаёміліся з вытворчасцю посуду і іншых шкляных вырабаў на шклозаводзе "Неман". Пабылі ў цэнтры МЧС. Там мы яшчэ раз успомнілі асноўныя правілы бяспечных паводзін на дарозе, пры пажары, як паводзіць сябе ў выпадку, калі аказаўся  ў ліфце, які спыніўся, праглядзелі навучальныя фільмы. А затым прашлі тэст, які паказаў, як мы засвоілі атрыманыя веды. Заключны этап экскурсіі - Лідскі замок. У вельмі займальнай форме нам расказалі гісторыю ўзнікнення замка. А затым мы змагаліся з крыжакамі, слухалі валынку, вучыліся страляць з лука,

арбалета. Экскурсія была вельмі цікавай і пазнавальнай.















27 снежня мы наведалі сталіцу нашай Радзімы – горад Мінск. Вельмі цікавай была аглядавая экскурсія па горадзе, падчас якой мы даведаліся якім быў Мінск у мінулым і якім ён прадстаў перад намі сёння. Падывалі ў нацыянальнай бібліятэцы і наведалі святочную праграму ў Беларускім дзяржаўным цырку.






16.02 мы наведалі музей воінаў - інтэрнацыяналістаў. Экскурсію правёў воін -

інтэрнацыяналістст выпускнік нашай школы Цветкоў Э. Рабяты змаглі даведацца пра падзеі вайны ў Афганістане, пра тое, як змагаліся ў далёкай краіне савецскія салдаты, як жылі, дапамагалі мясцовым жыхарам, як адзначалі святы, абаранялі межы Савецкага Саюза, праяўлялі мужнасць і адвагу ў экстрымальных умовах. Памянулі хвілінай маўчання тых салдат, якія не вярнуліся з гэтай вайны дамоў.

Кожны раз мы з цікавасцю наведваем музей імя Баграціёна ў нашым родным горадзе. Кожны раз мы для сябе адкрываем новыя старонкі нашай маленькай радзімы. Так было і ў гэты раз. Вельмі пазнавальнай аказалася экскурсія, на якой мы даведаліся, як жылі нашы землякі многа гадоў таму назад, чым займаліся, як праводзілі вольны час.







24 сакавіка мы адправіліся ў чарговае падарожжа па родным краі. У гэты раз мы наведалі  горад Гродна. Экскурсія прысвечана 75-годдзю утварэння Гродзенскай вобласці.

Надвор’е выдалася цудоўным. І таму  падчас аглядавай экскурсіі па гораду мы не толькі даведаліся многа новага пра горад Гродна, але і з цікавасцю прагуляліся па старажытных вуліцах горада. Вельмі пазнавальнай была экскурсія ў «Цікавым музеі». Тут мы пазнаёміліся з гісторыяй праса, убачылі прасы розных краін, змаглі самі папрасаваць  старажытным прасам. А яшчэ паслухалі музыку, якую слушалі нашы прабабулі і прадзядулі, якая гучала з грамафона.

Таксама мы пабывалі ў Грозенскім драматычным тэатры, дзе паглядзелі п’есу «Дзень нараждэння ката Леапольда», якая вучыць дабрыні і сапраўднаму сяброўству. Гэты дзень нам запомніцца надоўга. І  мы спадзяёмся, што яшчэ не раз пабываем ў горадзе Гродна, наведаем культурныя і гістарычныя цэнтры, прагуляемся па вулачках слаўнага города.




Прототип
стиральной машины
XIX – нач. XX вв.







12 мая выдаўся сонечны дзень. І мы адправіліся па месцах баявой славы. Наведалі вёску Карпаўцы, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны разам з дарослымі змагаліся і дзеці.





А таксама пабывалі ў вёсцы Шавулічы, якая была спалена нямецка – фашысцкімі захопнікамі. Тыя далёкія ваенныя гады болем адгукнуліся ў нашых сэрцах. Мы заўжды будзем памятаць тых, хто аддаў сваё жыццё за тое, каб сёння мы жылі пад мірным небам.




1941-
1945


ШКОЛА



**Другі блок нашай ініцыятывы -** знаёмства з паходжаннем прозвішчаў вучняў нашага класа.

Падчас рэалізацыі гэтага блока мы правялі наступныя мерапрыемствы:

1. Былі праведзены класная гадзіна “ Адкуль пайшло маё прозвішча”, дзе мы даведаліся пра гісторыю паходжання прозвішчаў. І, зыходжячы з



гісторыі ўзнікнення прозвішча, многія з нас змаглі даведацца адкуль паходзіць іх род, чаму іх продкаў звалі так, а не інакш. Як вынік нашай працы – слоўнік прозвішчаў вучняў нашага класа, якім мы папоўніклі кабінет беларускай мовы і літаратуры








СЛОЎНІК ПРОЗВІШЧАЎ
ВУЧНЯЎ 5 "А" КЛАСА


Кубышка – прозвішча маглі даваць невысокаму,
тоўсценькаму чалавеку, бо так называлі посуд з высокай гарлавінай і раздутымі бакамі.
Казак, Казачэнка – вольны чалавек, які не думае пра заўтрашні дзень.
Хладніцкі – такое прозвішча давалі чалавеку бяздушнаму, абыякаваму да чужой бяды.
Прозвішчы, якія паходзіць ад назвы птушак:
Сакалоўскі – ад сокал.

Мы лічым, што праект ініцыятывы рэалзаваны. На наступны год вынесены наступныя задачы:

- ***Далейшае знаёмства з культурнай і гістарычнай спадчынай нашага краю***
- ***Супрацоўніцтва з беларускамоўнай гімназіяй №23 г. Мінска, збор матэрыялаў па тэме: "Праяўленне нацыянальнага характару ў гульнях беларускіх і кітайскіх дзяцей"***